# РУХ НАПЕРАД ЁСЦЬ

## Так лічыць Аляксандр Лукашэнка, які зрабіў рабочую паездку ў Магілёўскую вобласць

**Як паведаміла прэс-служба беларускага лідара, кіраўніку дзяржавы было даложана аб выкананні яго даручэнняў па сацыяльна-эканамічным развіцці Магілёўскай вобласці і добраўпарадкаванні абласнога цэнтра. Праграма рабочай паездкі ўключала наведванне прадпрыемства «Тэхналіт» і ААТ «Магілёўскі завод ліфтавага машынабудавання».**

У час наведвання прадпрыемства «Тэхналіт» Прэзідэнту далажылі аб развіцці інавацыйных тэхналогій і арганізацыі вытворчасці высакаякасных дэталяў рухавікоў і гідратрансмісій, развіцці экспарту і імпартазамяшчэння. Аляксандр Лукашэнка асабліва цікавіўся перспектывамі развіцця прадпрыемства. «Тое, што створана добрая вытворчасць, — гэта факт. Але гэта зярнятка, якое добра ўзышло, прарасло. Сёння ўбяром, а заўтра трэба пасеяць, каб больш атрымаць. Павінен быць мультыплікатыўны эфект», — сказаў Прэзідэнт.

Міністр прамысловасці Віталь Воўк далажыў кіраўніку дзяржавы аб прапанове прадастаўць дадатковыя плошчы для развіцця «Тэхналіта» на магілёўскім заводзе «Строммашына», на базе якога прапануецца стварыць індустрыяльны парк з рознымі вытворчасцямі. Аляксандр Лукашэнка ўсумніўся ў неабходнасці такога кроку. «Мы дамаўляліся, калі прафсаюзы паставілі пытанне па «Строммашыне», што гэта прадпрыемства як адзіную каманду і тэрыторыю мы «пасадзім» на нейкую сур'ёзную вытворчасць», — сказаў беларускі лідар. Паводле яго слоў, як варыянт на плошчах «Строммашыны» можна было б наладзіць вытворчасць рознага абсталявання для калійнай галіны, паколькі цяпер на яго імпарт трацяцца вялікія сродкі. «І «Строммашына» будзе як цэласны комплекс, яго не трэба будзе дзяліць па цэхах, і так любое прадпрыемства можна падцягнуць, калі гэтага захацець».

Як расказаў журналістам дырэктар «Тэхналіта» Аляксандр Бадзяка, прадпрыемства паспяхова працуе і развіваецца дзякуючы распрацаванай інавацыйнай тэхналогіі ліцця, якая не аднойчы не ўжывалася нікім у свеце. «Мы атрымліваем высокую якасць ліцця для дробных серый дэталяў спецтэхнікі і занялі нішу, якая не пад сілу спецыялізаваным заводам, што масава выпускаюць такія вырабы», — сказаў ён.

Дырэктар растлумачыў, што стварэнне ліцейных вытворчасцяў на прадпрыемствах, якія маюць патрэбу ў невялікіх серыях такіх дэталяў, як правіла, прыводзіць да высокага сабекошту і нізкай якасці прадукцыі. «У выніку шэраг прадпрыемстваў у Беларусі і Расіі закрылі свае ліцейныя вытворчасці на карысць нашых вырабаў. Дробныя серыі дэталяў, якія яны рабілі пад сябе, перадалі нам, — расказаў Аляксандр Бадзяка. — У нас сёння ўжо не хапае вытворчых плошчаў, мы будуемся і развіваемся».

Разважаючы з працоўным калектывам ААТ «Магілёўскі завод ліфтавага машынабудавання», Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ў Беларусі будуць падтрымліваць малы і сярэдні бізнес у тым ліку за кошт кітайскіх рэсурсаў. «Мы дамовіліся з Кітайскай Народнай Рэспублікай, што фінансава недарагімі крэдытамі яны нам дапамогуць: выдзеляць пэўныя сродкі, каб мы маглі праінвеставаць такія прадпрыемствы», — адзначыў ён.

Кітай выдзеліць Беларусі прыкладна паўмільярда долараў для гэтых мэт. Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што малыя і сярэднія прадпрыемствы больш гібкія, яны гатовы вырабляць прадукцыю для гігантаў беларускай прамысловасці, якім нявыгадна выпускаць дробную прадукцыю для сваіх патрэб. Паводле слоў Прэзідэнта, наведваючы завод «Тэхналіт», ён яшчэ раз пераканаўся, што неабходна знаходзіць людзей, якія хочуць ствараць свае прадпрыемствы. «Іх трэба падтрымліваць аж да стварэння імі ўласнага прадпрыемства», — падкрэсліў беларускі лідар.

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што беларускія прадпрыемствы пераадолеюць спад прамысловай вытворчасці. «Рух ёсць. Думаю, што пасля сённяшняй гутаркі павялічым тэмпы руху наперад. Мы павінны пераадолець той спад, які адбыўся, на жаль, не па нашай віне. Сітуацыя была няпростая, але я бачу, што яна нават у Магілёўскай вобласці пачынае выпраўляцца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Галоўны мой клопат, каб людзі былі занятыя, але з адной толькі ўмовай: калі яны хочуць працаваць. Для жадаючых працаваць я гатовы рабіць усё, каб яны знайшлі сваё працоўнае месца. І такіх працоўных месцаў і ўмоў для стварэння працоўных месцаў сёння дастаткова», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Разам з тым кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што людзі павінны і самі шукаць для сябе работу. «Калі раптам у Магілёве не знойдзецца працоўнага месца, то яно будзе ў Бабруйску, Мінску, Гродне, Светлагорску, Добрушы», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што для тых людзей, якія хочуць і ўмеюць працаваць, у краіне будуць стварацца працоўныя месцы. «Але, давайце адкрыта, ці ўсе гэтага хочуць?» — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што наведаў Магілёўскую вобласць, каб вывучыць сітуацыю ў рэгіёне. «Я хацеў на свае вочы ўбачыць, у якім кірунку развіваецца горад і яго прадпрыемствы. За апошнія гады мы некалькі разоў падыходзілі да мадэрнізацыі рэгіёна, шмат ад чаго адмаўляліся. У чарговы раз у канцы мінулага года вызначыліся, у якім кірунку будзем развіваць нашы прадпрыемствы, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — У мінулым годзе скончылі стварэнне вытворчых аб'яднанняў і холдынгаў. Гэта дало магчымасць больш вырабляць уласнай прадукцыі. І мне было цікава, што адбываецца пасля ўсіх прынятых мер».

Наведваючы ААТ «Магілёўліфтмаш», Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклады аб развіцці прадпрыемства, аб выпуску новай прадукцыі і павышэнні яе канкурэнтаздольнасці. Таксама Прэзідэнт азнаёміўся з ходам тэхнічнага пераасначэння і вытворчасцю ліфтавага абсталявання па сучасных тэхналогіях.

Прэзідэнт таксама заслухаў даклад аб развіцці Магілёва і вобласці. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, у горадабудаўнічы план Магілёва неабходна дадаць глянцу і гармоніі. «Я сёння спецыяльна заязджаў у горад з боку Мінска. І дамы быццам бы ёсць прыгожыя. Але няма глянцу, добраўпарадкавання, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гармоніі ніякай».

Прэзідэнт адзначыў, што ў астатніх абласных цэнтрах ужо наведзены парадак і створана ўтульнасць. Аднак Магілёў адстае па гэтых пазіцыях. «Трэба разгледзець ва ўрадзе пытанне, чым мы можам дапамагчы ў гэтым кірунку. Але галоўнае, каб у вас быў па-гаспадарску складзены план мадэрнізацыі горада», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да кіраўніцтва Магілёва.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што да добраўпарадкавання горада таксама неабходна прыцягваць яго жыхароў. «Магіляўчане — спагадныя людзі», — заўважыў ён.

«Горад Магілёў за гэтую пяцігодку трэба прывесці ў ідэальны стан. Дзякуй Богу, у гарадскім бюджэце з'явіўся хоць нейкі прафіцыт, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Я ўпэўнены, што з Магілёвам мы справімся. Трэба прывесці горад у парадак, і тут для гэтага ёсць усё, асабліва яго жамчужына — Днепр».

# ПАКАРАННЕ ЗА ДОПІНГ ПАВІННА БЫЦЬ ПЕРСАНІФІКАВАНЫМ

## Прэзідэнт пракаментаваў апошнія скандалы ў спорце

**«Я катэгарычна падтрымліваю тых, хто змагаецца з гэтай заразай — допінгам. Нам гэта і па-дзяржаўнаму выгадна. Калі гэты працэс не кантраляваць, мы заўсёды будзем у хвасце, таму што багатыя і магутныя дзяржавы знойдуць, што падсунуць спартсменам. Нават тое, што сёння не забаронена», — заявіў Прэзідэнт, гутарачы з супрацоўнікамі «Магілёўліфтмаша».**

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што з'яўляецца прыхільнікам таго, каб пакаранне было персаніфікаваным. «Калі знайшлі вінаватага, пакарайце яго. Але як жа можна адхіліць усю каманду ад галоўнага спартыўнага свята — Алімпіяды. Гэта ж спартсмен, гэта яго жыццё!» — адзначыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы таксама пракаментаваў сітуацыю вакол беларускіх весляроў. «Я прынцыпова разбіраўся па нашых канаістах. 10 медалёў на апошнім чэмпіянаце свету ўзялі, і адразу да іх прэтэнзіі — 10 або 12 таблетак таго ж мілдраната ва ўрача, які нават не мае да каманды адносінаў і які па рэцэпце прымаў гэтыя таблеткі. Што такое 10 таблетак — гэта нішто, нават калі іх ужываць. Узялі і выключылі ўсю каманду. Пачалі разбірацца, а фактаў няма», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што даручыў беларускім спартыўным чыноўнікам паехаць у Швейцарыю ў Міжнародны спартыўны арбітражны суд і непасрэдна там адстойваць правы беларускіх спартсменаў. «Абараняйце хлопцаў, калі яны не вінаватыя. А калі вінаватыя — адкажуць на ўсю катушку, яшчэ і дададзім, за тое, што краіну ганьбяць», — сказаў Прэзідэнт.

«Гэтыя падыходы — агулам пакараць, хтосьці дзесьці сказаў, фактаў на руках няма і пачынаюць гнабіць, б'юць па тых, хто ў перспектыве можа атрымаць медаль на Алімпіядзе, — гэта кажа пра тое, што спорт даўно стаў вялікай палітыкай, нават становіцца нейкім тэатрам ваенных дзеянняў. Гэта няправільна», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз падкрэсліў, што барацьба з допінгам неабходная, але ў гэтым працэсе патрэбны выключна сумленны падыход. «Думаю, што пасля Алімпіяды і такіх скандалаў, калі Міжнародны алімпійскі камітэт не разбярэцца з гэтым, будзе пастаўлена пытанне і ў дачыненні да МАК. Навошта патрэбен такі камітэт, які мае паўнамоцтвы, але не можа навесці парадак», — выказаў Прэзідэнт сваё меркаванне.

■ Блізкая ўлада

# ЗРАЗУМЕЛА, ДАСТУПНА, ПРАЗРЫСТА

## Мясцовыя жыхары павінны ведаць, што, дзе і калі будзе рамантавацца і будавацца ў іх раёне

**Чатырнаццаць заяўнікаў выслухаў старшыня Мінаблвыканкама Сямён Шапіра падчас прыёму грамадзян на Валожыншчыне. Адно з самых актуальных пытанняў — стан дарог. Наконт уладкавання магістраляў да кіраўніка цэнтральнага рэгіёна звярталіся не мясцовыя жыхары, а мінчане, якія маюць дачы за горадам.**

Яшчэ раней Сямён Шапіра даваў даручэнне ў кожным раёне вобласці стварыць камісію па рамонце і будаўніцтве дарог. У Валожыне такой няма да гэтага часу. У раёне агляд дарог вядзе два разы ў год сезонная камісія, створаная загадам кіраўніцтва Мінскаблдарбуда. Яе ўзначальвае прадстаўнік Белдарцэнтра.

Старшыня Мінаблвыканкама запатрабаваў, каб функцыянавала менавіта раённая камісія. У яе павінны ўвайсці не толькі дарожнікі, прадстаўнікі мясцовай улады, але і старасты вёсак, мясцовыя жыхары. Менавіта апошнія лепш ведаюць, што патрабуе першачарговага рамонту. «Графік чарговасці неабходна змясціць у сродках масавай інфармацыі, на інтэрнэт-парталах, — патрабаваў старшыня аблвыканкама. — Грамадзяне маюць права ведаць, калі і што будзе рамантавацца, падсыпацца, асфальтавацца. Схема павінна быць зразумелай, даступнай і празрыстай».

З аналагічнай праблемай звярнуліся да кіраўніка сталічнай вобласці муж і жонка Дубіцкія, што жывуць у інтэрнаце ў Мінску. Сям'і, якая мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, выдзелілі ўчастак пад індывідуальнае будаўніцтва па вуліцы Бараной у аграгарадку Ракаў. Сужэнцы скардзіліся, што тут няма нават мінімальнай інфраструктуры: дарогі, электра- і водазабеспячэння.

— Шматдзетным сем'ям кошт работ па ўладкаванні інфраструктуры кампенсуецца з бюджэту, калі яны прадаставяць адпаведныя дакументы па затратах. Астатнія грамадзяне будуць пракладваць камунікацыі за свае ўласныя сродкі. Толькі для таго, каб у адным Мінскім раёне правесці электрычнасць да індывідуальнай забудовы, спатрэбіцца 4 трлн рублёў (недэнамінаваных. — **Аўт.**). Гэта зарплата медыкаў, настаўнікаў. Я павінен іх пакінуць без заробкаў? Такога не будзе! — запэўніў Сямён Шапіра. — У Мінскім раёне пабудавана 600 тыс. квадратных метраў жылля. Гэта ўдвая больш, чым у Магілёўскай



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

і Віцебскай абласцях разам узятых. Прычым, узводзяць дамы мінчане, а не жыхары Мінскай вобласці. Наплыў сталічных жыхароў у Мінскім раёне такі, што ўся вобласць не ў стане забяспечыць асфальтаванне дарог, інфраструктуру для іх. Калі чалавек захацеў жыць у лепшых умовах, узяў участак, пабудаваўся, то ўсё гэта павінна быць за кошт самога забудоўшчыка. Перш за ўсё сродкі абласнога бюджэту павінны ісці на лячэнне жыхароў Мінशчыны, вучобу іх дзяцей, забеспячэнне нармальнай жыццядзейнасці. Выключэнне, як я адзначыў, толькі для шматдзетных сем'яў — гэта ўказанне Прэзідэнта.

Некалькі шматдзетных звярнуліся да кіраўніка сталічнай вобласці і па пытаннях фінансавання будаўніцтва жылля па льготных крэдытах. «У гэтым плане на Міншчыне выпрацаваны алгарытм: не пачынаць новае будаўніцтва, а завяршыць ужо пачатае», — канстатаваў Сямён Шапіра.

Але камусьці для заканчэння будаўніцтва патрабуецца 100 млн недэнамінаваных рублёў, а іншаму, як, напрыклад, адной з заяўніц, 2 млрд. Толькі адзін металачарапічны дах цягне на кругленькую суму.

«Чаму такі дарагі праект, навошта архітэктурныя празмернасці? Можна было б абысціся і шыферам. А за гэтыя грошы дабудаваць 10 дамоў, — абурыўся Сямён Шапіра. — Сёння такую раскошу, вытанчанасць можа дазволіць сабе толькі прыватнік за свае ўласныя грошы».

Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна даручыў старшыні камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінаблвыканкама Сяргею Трусаву прааналізаваць спіс грамадзян-льготнікаў, якія не дабудавалі дамы, высветліць, якія сумы ім патрабуюцца, каб давесці жыллё да ладу. І праз тыдзень далажыць яму аб выніках.

«Выпрацуйце агульныя падыходы, якімі павінны быць будынкі, з якімі канструкцыямі, матэрыяламі, прааналізуйце іх кошт. Калі неабходна, то варта змяніць і праекты, каб яны былі без празмернасцяў і больш танныя», — канстатаваў Сямён Шапіра.

Пасля дэталёвага вывучэння інфармацыя будзе надрукавана ў СМІ. «Трэба, каб усё было аб'ектыўна, празрыста, справядліва. Усе шматдзетныя сем'і павінны быць у роўных умовах», — канстатаваў Сямён Шапіра.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■